

ЧАМУ ВУЧЫЦЬ ВАЛАНЦЁРСТВА? 3



ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ У КАРЦІНАХ 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

30 САКАВІКА 2024 г. СУБОТА

№ 64 (30198)

# ЗВЯЗДА

**Наталля КАЧАНАВА:**

## «Духоўна-маральныя каштоўнасці дапамагаюць ствараць базіс грамадзянскай ідэнтычнасці»

### Важная размова на вельмі важную тэму

**Грамадска-дзяржаўнае партнёрства ў захаванні духоўна-маральных каштоўнасцяў сучаснага грамадства — тэма настолькі рознабаковая і глыбокая, што абмяркоўваць яе можна пастаянна і кожны раз выносіць новыя важныя пасылы. Менавіта гэтай тэме было прысвечана выязное пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі. Яно прайшло ў месцы, прасякнутым духоўнасцю, — у Свята-Елісавецінскім манастыры. Кола ўдзельнікаў толькі членамі Савета Рэспублікі не абмежавалася. Разам з сенатарамі ўдзел у абмеркаванні важнай тэмы прынялі кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, намеснікі старшынь аблвыканкамаў, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, рэктары ўніверсітэтаў, моладзь.**



Фота БелТА.

Адкрываючы пасяджэнне, Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава згадала цытату Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі: «Беларусь — краіна вялікай культуры, найбагацейшай гістарычнай спадчыны, шматвяковых духоўна-маральных традыцый і невычэрпнага творчага патэнцыялу». Наталля Качанава звярнула ўвагу, што агульная задача ўсіх беларусаў — усяляк садзейнічаць захаванню і прымнажэнню гэтых каштоўнасцяў, якія народ Беларусі ствараў і развіваў на працягу шматвяковай гісторыі.

«У вечным пошуку станоўчага і добрага непарушнымі арыенцірамі выступаюць агульначалавечыя каштоўнасці і ідэалы. Бо маральнасць — гэта і ёсць жыццё чалавека. Гэта тое, што фарміруе ўнутраны стрыжань асобы, вызначае пачуцці, характар думак. А ад духоўнасці залежыць будучыня грамадства. Духоўна-маральныя каштоўнасці дапамагаюць ствараць базіс грамадзянскай ідэнтычнасці — прыналежнасць да сваёй Радзімы і гонар за яе, павага да яе гісторыі. Выхаванне на аснове гэтых каштоўнасцяў далучае да культурных традыцый свайго народа, прыяе развіццю працавітасці, павагі да людзей, прывівае любоў да сям'і, Айчыны, навакольнага свету. Дзякуючы духоўна-маральнаму выхаванню фарміруюцца пачуцці сумленнасці, спачування, суперажывання і даверу, выяўляюцца высокія маральныя якасці: дабрыня, міласэрнасць, сумленнасць, справядлівасць — усё тое, што называецца чалавечнасцю», — падкрэсліла спікер.

Наталля Качанава звярнула ўвагу, што сёння, на жаль, людзі часта абыякавыя да таго, які след пакінуць пасля сябе на гэтай зямлі. Змена каштоўнасцяў адбываецца далёка не ў лепшы бок. Сацыяльнай нормай лічыцца грамадзянскі шлюб, свядомая адмова ад нараджэння дзяцей, наўмысная адзінота. Кнігі і жывыя чалавечыя зносіны падмяняюцца сацыяльнымі сеткамі, акунаннем у сусветнае павуцінне, сыходам ад рэальнасці. Духоўныя каштоўнасці выцясняюцца асабліва вузкаасабістымі, «харчова-рэчавымі» жаданнямі, спажывецкім стаўленнем да ўсіх і да ўсяго.

СТАР. 2

# СВЯТА РАДАСЦІ І НАДЗЕІ

*Хрысціянам Беларусі,*
*якія святкуюць Вялікдзень 31 сакавіка 2024 года*

***Дарагія суайчыннікі!***

***Шчыра віншую вас са святам Вялікадня.***

***Яно нясе ў сабе глыбокі сэнс жыватворнай веры ў вечныя ідэалы дабра і справядлівасці.***

***Уваскрэсенне Хрыстова аб'ядноўвае нас вакол сапраўдных хрысціянскіх каштоўнасцяў, вяртае да спрадвечных якасцяў беларускага народа: самаахвяравання, брацкай узаемадапамогі і імкнення служыць роднай зямлі.***

***У велікодныя дні сэрца кожнага верніка перапаўняецца вялікай радасцю, якая ўмацоўвае дух, усяляе надзею на светлую будучыню.***

***Няхай Вялікдзень натхняе вас на добрыя справы і напаўняе жыццё любоўю. Моцнага здароўя, шчасця, міру і згоды вам і вашым блізкім.***

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«З упэўненасцю магу адназначыць, што ўстойлівасць адкрытай беларускай эканомікі ў многім забяспечана пераарыентацыяй экспарту з заходніх рынкаў, якія закрыліся з-за санкцый, на рынкі еўразійскага рэгіёна. І такая рэзультатыўная пераарыентацыя стала магчыма дзякуючы глыбокай эканамічнай інтэграцыі Беларусі з дзяржавамі — партнёрамі па СНД і ЕАЭС, а таксама і ШАС, над набыццём паўнапраўнага членства ў якой Беларусь працягвае працаваць».*

Цуд жыцця

## ЖАДАННІ СПРАЎДЖВАЮЦЦА!

### Шматразовая чэмпіёнка Беларусі па спартыўных танцах на калясках Ірына Мінюк нарадзіла дачку

**Гэта ўжо другое дзіця ў сям'і спартсменкі з Івацэвічаў. На выпіску з радзільнага дома сустракаць маладую маці з нованароджанай Каралінай прыехалі яе муж Юрый і старэйшы сын 11-гадовы Максім. Павіншаваць падапечную прыйшоў і кіраўнік Беларускага фонду дапамогі спартсменам-інвалідам Валерый Каламіец, які расказаў, што ў сем'ях яго выхаванцаў за апошнія гады нарадзілася 25 дзяцей.**

Традыцыйны бела-ружовы карункавы «канверт», які медработнікі ўрачыста ўручаюць тату, цёплыя абдымкі з роднымі — і слёзы нават на вачах журналістаў, не кажучы пра блізкіх. Ірына, як і належыць сапраўднай спартсменцы, хутка спраўляецца з эмоцыямі і гатова падзяліцца ўражаннямі:

СТАР. 3



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Страты замежных кампаній ад сыходу з Расіі перавысілі $107 млрд

Замежныя кампаніі, якія сышлі з расійскага рынку пасля пачатку канфлікту ва Украіне, страцілі больш чым 107 мільярдаў долараў, паведаміла Reuters. Пры гэтым аб'ём страт павялічыўся на траціну з моманту апошняга падліку ў жніўні 2023 года, што «ўказвае на маштаб фінансавага ўдару па карпаратыўным свеце». «Кампаніі, якія ўсё яшчэ імкнуцца пакінуць Расію, хутчэй за ўсё, сутыкнуцца з далейшымі цяжкасцямі і будуць вымушаны змірыцца з вялікімі спісаннямі і стратамі», — папярэдзіў Ян Мэсі з кансалтынгавай кампаніі па глабальных рызыках S-RM. Паводле даных Ельскай школы менеджменту, каля тысячы замежных кампаній сышлі з Расіі з лютага 2022 года, хаця сотні іншых працягваюць весці бізнес у краіне.



Сярод іх Reuters называе Mondelez International, PepsiCo, Auchan, Nestle, Unilever, Reckitt, British American Tobacco. Акрамя таго, многія вытворцы тавараў паўсядзённага попыту ўстрымліваюцца ад поўнага сыходу, аргументуючы гэта тым, што спажыўцы ў Расіі выкарыстоўваюць іх прадукцыю.

### З Парыжа перад Алімпійскімі гульнямі вывезлі сотні бяздомных і мігрантаў

Сотні мігрантаў і бяздомных былі вывезены з Парыжа ў іншыя рэгіёны Францыі на чартарных аўтобусах. Пра гэта паведаміў Euronews. Адзначаецца, што мінімум 500 мігрантаў і бяздомных пасадзілі ў аўтобусы і вывезлі з французскай сталіцы. Некаторыя няўрадавыя арганізацыі сцвярджаюць, што ўлады праводзяць кампанію, накіраваную на тое, каб зрабіць Парыж «больш прэзентабельным» падчас Алімпійскіх гульняў, якія маюць адбыцца. Урад Францыі сцвярджае: зробленыя крокі былі выкліканы тым, што цэнтры часовага размяшчэння мігрантаў у дадзены момант перапоўнены. Мэры французскіх рэгіёнаў тым часам выказваюць сваё абурэнне наконт зноў прыбылых, адзначае Euronews. Так, мэр Арлеана Серж Груар заявіў, што такія перасяленні выклікаюць трывогу.



ISSN 1990 - 763X

### Кожны дзясяты італьянец жыве ў абсалютнай беднасці

У мінулым годзе кожны дзясяты італьянец жыў у абсалютнай беднасці. Аб гэтым сведчаць даныя Нацыянальнага інстытута статыстыкі (ISTAT), перадае «Сіньхуа». Паводле гэтай інфармацыі, летась 5,75 мільёна італьянцаў жылі ў абсалютнай беднасці, у 2022-м — 5,67 млн і ў 2021-м — 5,32 млн. У мінулым годзе гэтая група складала 9,8 працэнта насельніцтва краіны. Па вызначэнні ISTAT, чалавек, які жыве ў абсалютнай беднасці, — гэта той, хто не мае сродкаў для задавальнення сваіх асноўных патрэб, такіх як ежа і чыстая пітная вада, адзенне, медыцынскае абслугоўванне і жыллё. Паводле звестак ISTAT, самы высокі ўзровень абсалютнай беднасці быў зафіксаваны ў пераважна сельскагаспадарчых паўднёвых рэгіёнах краіны, а самы нізкі — у прамыслова развітых паўночных. Пры гэтым на поўначы назіраецца больш хуткі рост узроўню беднасці ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі.



## АФІЦЫЙНА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў указы, у адпаведнасці з якімі шэраг службовых асоб вызвалены ад займаных пасад. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэсслужбе беларускага лідара.

Ігар Сергеенка вызвалены ад пасады кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сувязі з пераходам на выбарную пасаду служачага.

На той жа падставе вызвалены ад пасад міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына Касцевіч, памочнік Прэзідэнта — інспектар па г. Мінску Аляксандр Барсукоў, дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Вадзім Іпатаў, рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі Вячаслаў Даніловіч.

Таксама генерал-маёр Генадзь Ляпешка вызвалены ад пасады начальніка ўстановы адукацыі «Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь», а генерал-маёр юстыцыі Андрэй Ліс — ад пасады начальніка ўпраўлення Следчага камітэта па Мінскай вобласці. Імі прыпынена, адпаведна, ваенная служба і служба ў Следчым камітэце ў сувязі з выбраннем дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу на тэрмін іх паўнамоцтваў.

Мікалай Маратаеў вызвалены ад пасады намесніка старшыні і суддзі Гомельскага абласнога суда ў сувязі з выбраннем на іншую пасаду. Ён таксама выключаны са складу прэзідыума Гомельскага абласнога суда.

Па-за палітыкай

## ДЗВЕ КРАІНЫ — АДЗІН ЛЕС

### Тыя, хто штучна яго падзяляе, не думаюць пра будучыню



**27 сакавіка рэактыўная маніторынгавая місія ЮНЕСКА/МСАП, якая праводзіць ацэнку ўздзеяння загараджальнай пабудовы на беларуска-польскай граніцы, завяршыла сваю работу ў Беларусі. На працягу чатырох дзён міжнародныя эксперты сумесна з прадстаўнікамі Мінпрыроды, Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Камітэта дзяржкантролю, Дзяржпагранкамітэта, ДПУ «Нацыянальны парк «Белавежская пушча», органаў мясцовага самакіравання і грамадскасці даследавалі частку пушчы на тэрыторыі Брэсцкай і Гродзенскай абласцей.**

Як расказаў на выніковай прэс-канферэнцыі **першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр КОРБУТ**, у студзені 2022 года без правядзення неабходных будаўнічай і экалагічнай экспертызы польскі бок пачаў узвядзенне агароджы, якая праходзіць у тым ліку і па тэрыторыі трансгранічнага аб'екта Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА «Белавежская пушча». У чэрвені таго ж года аб'ект, які складаецца з бетону, жалеза і калючага дроту, быў завершаны.

На думку беларускіх вучоных, з-за штучнага раздзялення пушчы і ўзведзенага загараджальнага збудавання ўзнікла рэальная пагроза існаванню рэдкіх і асабліва каштоўных прыродных комплексаў. Парушэнне глебавага покрыва прыводзіць да змены ўзроўню грунтавых вод, што, у сваю чаргу, можа прывесці да гібелі сараўзроставых лясоў, дэградацыі забалочаных тэрыторый і водна-балотных угоддзяў. Блакіраванне сталых міграцыйных калідораў буйных млекакормячых, падзел папуляцый рысі і ваўка негатыўна адбіваюцца на стане біяразнастайнасці рэгіёна. Транспартны трафік, які павялічыўся, служыць патэнцыяльнай пагрозай для распаўсюджвання інвазійных відаў раслін, у першую чаргу гэта сумнік канадскі.

Беларускі бок яшчэ на этапе прыняцця польскім бокам рашэння аб узвядзенні агароджы шматразова звяртаўся ў міжнародныя прыродаахоўныя структуры ААН з патрабаваннем не дапусціць будаўніцтва, якое разбурае экасістэму Белавежскай пушчы. Аднак ніякай рэакцыі не было. І толькі ЮНЕСКА як арганізацыя, якая сапраўды добрасумленна і абсалютна непрадузята выконвае свае функцыі, адрэагавала і ўключыла ў парадак 45-й сесіі Камітэта Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА пытанне аб стане трансгранічнага аб'екта «Белавежская пушча».

СТАР. 2